зительном содержании музыкально-звуковой реальности просматривается содержание реальности социальных жизненных ценностей личности.

Художественно-воспитательные возможности музыки являются важным средством эмоционального и нравственно-эстетического развития сознания студентов музыкальной специализации.

---

1. *Кабалевский, Д. Б.* Музыкальное воспитание в СССР / Д. Б. Кабалевский. – Вып. 1. – М. : Знание, 1978. – С. 72.

2. *Назайкинский, Е.* О психологии музыкального восприятия / Е. Назайкинский. – М. : Знание, 1972. – С. 75.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВЯЛІКІЯ ПАДЗЕІ 1939 г. У ЛЮСТЭРКУ МАЛОЙ РАДЗІМЫ

***М. А. Бяспалая,***
*доктар гістарычных навук, прафесар,*
*загадчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Пасляваеннае пакаленне, да якога належыць і аўтар артыкула, выхавана на савецкай інтэрпрэтацыі як агульнай, так і мясцовай гісторыі. Аднак з пазіцыі цяперашняга дня іназапашаных ведаў можна схіляцца не да аднабаковых прамалінейных высноў, а паспрабаваць скласці шматкаляровую карціну падзей 80-гадовай даўніны, якія адбываліся на малой радзіме.

Цэнтрам асабістага сусвету была і застаецца заходнепалеская вёска з непаўторнай на ўсёй тэрыторыі краіны назвай – Выжлавічы. Першы ўспамін аб ёй адносіцца да канца XV ст. (1495), у XIX ст. веска належала памешчыку Аляксандру Хржаноўскаму, у канцы XIX ст. маёнтак перайшоў да ўдавы генерала Вольгі Ціздзель. Яна і яе нашчадкі валодалі бага-

тым маёнткам, які ўваходзіў у дзесятку буйнейшых лясных гаспадарак Мінскай губерні да верасня 1939 г. Старая пані памерла да гэтага часу і была пахавана каля мясцовай Пакроўскай царквы.

Жыхары вёскі вызначаліся актыўнай жыццёвай пазіцыяй, што праяўлялася ў падпольнай дзейнасці на працягу 1920–1930-х гг. Пэўны час на нелегальным становішчы ў вёсцы пражываў член КГЗБ, а ў будучым вядомы беларускі пісьменнік Піліп Пястрак. Ён быў накіраваны ў Пінскі павет для арганізацыі падпольнай работы. Многія мае землякі, у тым ліку дзядулі А. Захарчук (з матчынага боку) і А. Сергеежк (з бацькавага боку) зведалі цяжкасці і здзекі ў канцлагеры Бяроза-Картузская.

Больш шырокі арэал малой радзімы – былы Паршавіцкі, цяпер Бярозаўскі сельсавет. Да тэмы артыкула мае дачыненне такое адміністрацыйна-тэрытарыяльнае ўтварэнне, як Жабчыцкі раён (быў утвораны 15 студзеня 1940 г. і скасаваны ў кастрычніку 1957 г.) Пінскай вобласці, якая існавала з 4 снежня 1939 г. па 8 студзеня 1954 г.; з 1921 па 1939 г. гэта быў Пінскі павет.

У аснову артыкула пакладзены дакументы з НМЦ «Занальны архіў у г. Пінску».

Падзеі верасня 1939 г. выклікаюць розныя эмоцыі і ацэнкі: ад рэзка крытычных да выразна ўзнёслых. На наш погляд, у аснову разважанняў трэба пакласці ўяўленне аб іх уплыве на лёс беларускага народа, які ўрэшце-рэшт аб’яднаўся ў межах адзінай дзяржавы, нягледзячы на тое, што партыйныя стратэгі, мабыць, не бралі ў разлік нацыянальна-патрыятычныя імкненні беларусаў. Яны проста выбухнулі пасля 17 верасня. На Піншчыне ствараліся ўзброеныя групы, якія бралі пад ахову стратэгічна важныя аб’екты, быў захоплены мост праз р. Ясельда, заняты буйныя чыгуначныя станцыі, устаноўлены кантроль над участкам шашы Пінск–Брэст. Вечарам 21 верасня ў горад ўвайшлі часці Чырвонай арміі і паўстан-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цкія атрады. Пачалася новая старонка ў жыцці малой радзімы.

У першую чаргу ствараліся часовыя (да выбараў) органы новай улады. Іх арганізатарамі і кіраўнікамі ў многіх выпадках станавіліся былыя ўдзельнікі антыпольскай барацьбы. Напрыклад, Паршавіцкі сельскі савет узначаліў В. Глінскі, у іншых установах пачалі працаваць Ц. Зырка, А. Прыступа, Ю. Сергеюк, К. Слесарчук і др. Галоўная падзея, якая выклікала небывалую ўзрушанасць насельніцтва, – выбары ў Народны сход Заходняй Беларусі. Згодна афіцыйным даным на Піншчыне ў іх прынялі ўдзел 99, 2 % насельніцтва, а за вылучаных кандыдатаў прагаласавалі 98,52 %. Калі прыняць да ўвагі навізну такой падзеі, як выбары і агульны ўздым сімпатый да новай улады, якая пачала раздаваць сялянам памешчыцкія і асадніцкія землі, нацыяналізаваць прыватную ўласнасць польскіх чыноўнікаў і прадпрымальнікаў, а многіх і пераследаваць, то прыведзеныя лічбы, хутчэй за ўсё, амаль адпавядаюць сапраўдным.

У кароткі прамежак часу – з верасня 1939 г. па чэрвень 1941 г. сканцэнтравалася такая колькасць падзей, што тагачаснаму малаадукаванаму насельніцтву і мясцоваму кіраўніцтву не выпадала ніякай магчымасці іх прааналізаваць і зразумець. Магія шматлікіх пастаноў, загадаў, мерапрыемстваў проста заварожвала. Пры гэтым калі ўявіць, што большасць насельніцтва Пінскага павета (на 1931 г. – 184305 чалавек, з іх – 149560 сялян) былі вяскоўцы, якія з энтузіязмам «ліквідавалі» культурныя гаспадаркі вывезеных асаднікаў, то сітуацыя становіцца яшчэ больш выразнай.

У маі 1941 г. партыйная камісія Пінскага абкама КП(б)Б правярала работы ў Жабчынскім раёне, вынікі якіх былі абмеркаваны на пленуме. Адзначалася, што дэпутаты ў асноўным малаадукаваныя. На адказныя пасады вылучаюцца тыя, хто навучаецца грамаце, у сельскіх саветах раёна створана 83 пастаянныя камісіі, затое не было аграномаў, вет-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

урачоў, заатэхнікаў. Высокі партыйны сход адзначаў, што Паршавіцкі сельсавет мае дастаткова рэальныя планы пасяджэнняў з пытаннямі аб сяўбе, меліярацыі, бюджэце, школьнай справе, прадугледжаны справаздачы дэпутатаў, старшынь калгасаў і г. д. Мабыць, каб падкрэсліць становучае ўражанне аб планах Паршавіцкага сельсавета, на пленуме агучылі план агульнага сходу ў в. Забораўцы Лагішынскага раёна, які складаўся з 23 пытанняў, да прыкладу: аб недатыкальнасці асобы, самасудах, бойках, варожасці, разводах, «поведении барышень и кавалеров» і г. д.

Безумоўна, для вяскоўцаў жыццевызначальным пытаннем заставалася зямельнае. У першых вераснёўскіх загадах вышэйстаячых устаноў падкрэслівалася, што «никаких колхозов пока не строить и никаких призывов к устройству пока не делать». У далейшым новыя ўлады не ўтрымаліся і адышлі ад сваіх ранейшых пастаноў. Па дакументах не прасочваецца, на якой падставе – ці па загаду савецкіх органаў, ці па ініцыятыве саміх сялян, падтрыманай новай уладай, – пачынаецца стварэнне калгасаў. У роднай вёсцы, па ўспамінах відавочцаў і ўдзельнікаў, гэты працэс пачаўся па інцыятыве яе жыхароў.

Для пэўнай часткі землякоў у стварэнні калектыўных гаспадарак, аб поспехах якіх у СССР яны чулі ці чыталі, бачылася выйсце са складанага эканамічнага стану. Працэс добраахвотнай арганізацыі калгасаў распачаўся вясною 1940 г., аднак ні ў якім разе нельга ігнараваць выразны патрыятычны ўздым сярод вяскоўцаў. Прыкметнай актыўнасцю вызначалася родная вёска і ў цэлым Жабчыцкі раён, у склад якога яна ўваходзіла. Па Пінскай вобласці было арганізавана 22 калгасы, а па ўсёй Заходняй Беларусі – 430.

У некаторых вёсках у калгасы запісваліся ўсе двары. У Выжлавічах 15 красавіка 1940 г. 170 двароў добраахвотна ўтварылі калектыўную гаспадарку імя 17 верасня, якая праіснавала да пачатку вайны. Адзначым, што ў чэрвені

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1940 г. з калгаса выйшла 6 найбольш заможных гаспадарак. Калгас імя 17 верасня меў 971 га зямлі, з іх ворнай – 448 га, сенажаці – 277 га, выган – 118 га і непрыгоднай зямлі (пясчаная залеж) – 128 га. З абсталявання калгасу належала малацілка, рухавік, сашніковая сеялка, шалі соценныя і дзесяцярычныя, супрацьпажарны насос, кавальскія мяхі, два малаты і ціскі.

Людзі працавалі, не шкадуючы сябе, як апантаныя, каб наблізіцца да таго ідэалу, аб якім яны шмат чулі ад сваіх больш дасведчаных аднавяскоўцаў. Падчас жніва жанчыны жалі так, што апухалі рукі, трацілі прытомнасць, і ўсё гэта – у імя ідэі і ўяўнай мэты ўсеагульнага дабрабыту. Своеасаблівым паказчыкам расчаравання ў калектыўным гаспадаранні стала прымусовае аднаўленне калгасаў у 1949., калі большасць былых калгаснікаў адмаўлялася добраахвотна зноў уступаць у калгас.

Важнае дасягненне савецкай улады – наладжаная сістэма адукацыі, якая была перанесена ў Заходнюю Беларусь. Школьная сетка дасягнула амаль 6 тыс. школ, у тым ліку 120 сярэдніх. У школу пайшлі дзеці, якія раней не мелі магчымасці вучыцца. На тэрыторыі заходніх абласцей працавала 5 інстытутаў і 12 тэхнікумаў. Вельмі вострай з'яўлялася кадравая праблема. Згодна архіўным дакументам у Пінскай вобласці толькі 128 настаўнікаў мелі вышэйшую адукацыю, з 10 сярэдніх школ толькі чатыры ўзначальвалі асобы з вышэйшай адукацыяй, у 126 няпоўных сярэдніх – 17. Сярод настаўнікаў 50 чалавек не мелі ні спецыяльнай адукацыі, ні вопыту.

Актыўна ўдзельнічалі ў наладжванні новага жыцця створаныя дзяржаўныя ўстановы з напрацаванымі за савецкі час формамі і метадамі палітычнага і культурнага асветніцтва, структурай адпаведных органаў. Савецкі вопыт эканамічнага, культурнага і палітычнага будаўніцтва быў механічна пашыраны на заходнія вобласці. У 1941 г. тут дзейнічала 220 бібліятэк, 92 дамы культуры, 100 кінатэатраў. Палітычнае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асветніцтва аўтыматычна паўтарала звыклую структуру – хаты-чытальні, як нізавыя звёны, народныя дамы ў буйных пасёлках і дамы культуры ў гарадах. Накірункі, формы і метады іх працы дастаткова былі прадсказальныя, а галоўным зместам заставалася забеспячэнне шырокай падтрымкі дзяржаўнай палітыкі. Аднак зноў жа паўставала праблема кадраў. Яе спрабавалі вырашыць праз арганізацыю курсаў падрыхтоўкі бібліятэкараў, хатнікаў, клубных работнікаў, але і гэта не палепшыла сітуацыю, таму што ніхто не аказваў ім рэальнай дапамогі.

Іншая справа – культурнае асветніцтва, асабліва падтрымка масавай ініцыятывы ў арганізацыі самадзейнай мастацкай творчасці з мэтай паляпшэння палітычнага, культурнага і мастацкага выхавання насельніцтва. Пад кіраўніцтвам Упраўлення па справах мастацтва пры СНК БССР ствараліся Дамы народнай творчасці (ДНТ) пры абласных аддзелах мастацтваў. Метады працы ДНТ былі ідэнтычны папярэдняму савецкаму перыяду: інструктыўныя нарады, нарады-кансультацыі на месцах, рассылка метадычных пісем па пытаннях арганізацыі гурткоў, падрыхтоўцы да выбараў, да творчых алімпіяд, да 8 Сакавіка, да 1 Мая, да чарговай гадавіны Кастрычніка, Сталінскай Канстытуцыі і г. д.

На працягу некалькіх месяцаў былі створаны харавыя, драматычныя, аркестравыя, танцавальныя гурткі. Напрыклад, у в. Паршавічы моладдзю быў арганізаваны харавы і танцавальны гурток, кіраўніцтва якім ажыццяўляў М. І. Васільеў з адукацыяй у пяць класаў гімназіі і самавук (так запісана ў дакуменце) па мастацтву. Паршавіцкі гурток складаўся з 39 чалавек, з іх 22 мужчыны, узрост гуртkоўцаў ад 17 да 40 гадоў. Самадзейныя артысты актыўна далучаліся да абслугоўвання выбарчых участкаў падчас выбараў рознага ўзроўню. Яны рыхтавалі спецыяльныя праграмы, развучвалі песні з абавязковага рэпертуару, мясцовыя ўмельцы афармлялі ўчасткі. Падчас выбараў гурткоўцы выступалі з канцэртамі, нават па некалькі ў дзень.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сацыякультурная сітуацыя ў заходніх раенах БССР не была адназначнай. Для многіх жыхароў устанаўленне савецкай улады несла шмат гора. Справа была не толькі ў канфіскацыі маемасці, але і ў іншых рэпрэсійных мерах. Першыя арышты былі праведзены ўжо восенню 1939 г., а ў лютым, красавіку і чэрвені 1940 г. адбыліся масавыя дэпартацыі жыхароў Заходняй Беларусі, наступная хваля – у чэрвені 1941 г. Напрыклад, з Пінска эшалон з дэпартыруемымі людзьмі адправіўся ў 4 гадзіны раніцы 22 чэрвеня 1941 г. Згодна афіцыйным даным было рэпрэсіравана каля 150 тыс. чалавек. У Паршавіцкім сельсавеце зведалі рэпрэсіі 20 сем'яў – былыя асаднікі і вяскоўцы.

На наш погляд, сказанае вышэй дазваляе зрабіць выснову, што падзеі верасня 1939 г. – чэрвеня 1940 г. у родных мясцінах адлюстроўваюць агульны працэс палітычных, эканамічных, сацыякультурных перамен. Асаблівую выразнасць іх раскрыццю надаюць як знаемства аўтара са многімі ўдзельнікамі тагачасных падзей, іх успамінамі і ўражаннямі, так і магчымасць супаставіць іх з падзеямі большага маштабу, знайсці агульнае і асаблівае.

## НЕМАТЕРИАЛЬНОЕ КУЛЬТУРНОЕ НАСЛЕДИЕ КИТАЯ КАК ФАКТОР ФОРМИРОВАНИЯ ПАТРИОТИЗМА

***Ван Дань,***
*аспирант кафедры культурологии*
*Белорусского государственного университета культуры и искусств*

Культура, являясь результатом жизнедеятельности человека, определяет и формирует у ее субъектов чувства любви к малой родине в глобальном межкультурном пространстве. Китай избрал свою самобытную пятитысячелетнюю культу-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ